ВЕСЬНІК

Беларускага Каталіцкага Душпастырства

Но. 1(6) Лёндан Вялікдзень 1989

ХРЫСТОС УВАСКРОС !

СЬВЕТ, У ЯКІМ ЖЫВЕМ

Зусім нядаўна я з жахам даведаўся, што мой халадзільнік не зьяўляецца такой нявіннай і няшкоднай прыладай. Вучоныя даказалі, што хімічныя рэчывы, якія ўжываюцца да ахаладжваньня, зьяўляюцца адной з прычынаў "дзірак" у азонным слаі, які акружае зямлю і ахоўвае яе ад шкодных сонечных праменяў, прапускаючы толькі прамені карысныя і патрэбныя да жыцьця.

Справа з халадзільнікам, магчыма з прычыны сваёй на першы погляд нязначнасьці, дала мне адчуць, што сьвет, у якім жывем - адзін і што мы залежныя адзін ад другога і ад навакольнага асяродзьдзя. Усьведамленьне гэтага змушае мяне адносіцца з асьцярожнасьцю да г.зв. навукова-тэхнічнага прагрэсу. Розум людзкі – цудоўны дар Божы, дзякуючы якому пазнаем навакольны сьвет. Аднак у практычным прымяненьні здабытых ведаў існуе небясьпека, што з прычыны нашай абмежаванасьці мы, пры найлепшай волі, не заўсёды можам прадбачыць усе вынікі нашай дзейнасьці, асабліва на далейшую мэту. Сапраўдная трагедыя паўстае, калі мы паступаем безадказна, бяздумна, або думаючы толькі пра асабістую карысьць. У многіх выпадках вынікі такой дзейнасьці непапраўныя. Яны жывуць у наступных пакаленьнях. Для беларусаў, якія павінны жыць э наступствамі Чарнобыльскай трагедыі, гэтага ня трэба тлумачыць.

Сказанае вышэй ня новае: мы ўсе адчуваем на сабе глыбока ўкаранёны ў нашай людзкой прыродзе вынік учынку нашых першых прабацькоў, які мы завем першародным (або "радзім--м") грахом.

Не ўглыбляючыся ў дакладны характар першароднага граху, можна сказаць што гэта было сцьверджаньне самавыстарчальнасьці чалавека ў адносінах да Тварца, жаданьне "быць як Бог, ведаць дабро і зло" (Быцьцё 3:5). У сутнасьці гэта было запярэчаньне патрэбы Бога, а адтуль толькі адзін крок да запярэчаньня самога Яго існаваньня. У выніку, як добра сказаў нядаўна адзін беларус, "у бязбожнага чалавека складваюцца

ўсьведамленьне канечнасьці свайго быцьця. Гэта вельмі небясьпечнае ўсьведамленьне, бо яно дэмаралізуе асобу, нараджае пачуцьцё безадказнасьці за свае ўчынкі".

Бог, стварыўшы сьвет, "убачыў, што ўсё вельмі добра" (Быцьцё 1:31). Ён бачыў усё тварэньне, як адну цэласьць, у якой кожная частка мае сваё месца і назначэньне. Чалавек займаў асобае месца ў агульным пляне, бо Бог стварыў яго "на свой вобраз і падабенства" (Быцьцё 1:27) і даў яму ўладу "над рыбамі марскімі, і птушкамі нябеснымі, над зямлёй і над усякай істотай, што жыве на ёй" (там жа).

Адным з вынікаў першага граху была страта пачуцьця еднасьці тварэньня. Сьвет быццам разьбіўся на маленькія "сьветы", кожны са сваімі асабістымі, карысьлівымі інтарэсамі. Гэта знайшло адбітак у нашых дачыненьнях да навакольнага сьвету, да ўсяго стварэньня, якое, паводле слоў сьвятога Паўла, "стогне і ўздыхае да сёньняшняга дня" (Рым. 8:22).

Чалавек ня быў у сілах направіць гэты сумны стан рэчаў, але Бог не пакінуў яго. Ён сам стаўся чалавекам, прыняўшы людзкую прыроду і, злучыўшы яе з боскаю ў асобе Госпада Нашага Ісуса Хрыста, ўзьняў яе да вечнага жыцьця ў дзень Уваскрасеньня. Ён адмяніў вынікі першага граху, даючы нам магчымасьць вярнуцца да першаснага стану і ўдзелу ў Боскім жыцьці. Гэта была перамога над грахом і сьмерцю, але яна была купленая дарагой цаною, менавіта сьмерцю на Крыжы.

Такая логіка Божых дачыненьняў да чалавека. Яна вынікае са слоў Хрыста: "Сын Чалавечы не прыйшоў, каб Яму служылі, але каб служыць і аддаць жыцьцё сваё як выкуп за многіх" (Мк. 10:45). Ці часам не хацеў Ён гэтым сказаць нешта важнае для нас, асабліва для "сільных гэтага сьвету"? Сярод радасьці Вялікодных сьвяткаваньняў магчыма ня шкодзіла б нам знайсьці час, каб глыбей задумацца над значэньнем маленькага слова "служыць".

а. Аляксандар Надсон

Вялікдзень 1989

САПРАЎДЫ ЎВАСКРОС !

ДЗЕНЬ МАЛІТВАЎ ЗА ПАКЛІКАНЬНІ

Як прыгожыя ногі тых, што абвяшчаюць добрую вестку (Ізая 52:7).

Нядзеля 23 красавіка будзе сусьветным днём малітваў за сьвятарскія пакліканьні.

Сьвяты Павал, будучы ў Атэнах, так зьвярнуўся да жыхараў гэтага гораду: "Людзі атэнскія... бачу, што вы вельмі набожныя. Праходзячы міма і агледаючы вашы сьвятыні, я знайшоў адзін ахвярнік з надпісам «Няведамаму Богу». Вось Таго, якога вы шануеце, ня ведючы, я вам прапаведую" (Дзеяньні 17:22-23).

Амаль дзьве тысячы гадоў мінула ад гэтага часу, але патрэба прапаведаваньня "Няведамага Бога" ў нашы дні ня меншая, як тады. Матэрыялізм (практычны і як сьветапогляд) ня змог задаволіць многіх, пакінуўшы пустэчу ў іхніх душах. Адчуваецца моцная цяга да духоўнага, голад веры. Аднак ёсьць небясьпека, што ў пошуках веры многія могуць зблудзіць і, замест Хлеба знайсьці камень. Бо "Як яны маглі ўверыць у Таго, аб якім ня чулі? А як маглі чуць, калі ніхто ім не абвясьціў? Але ж як маглі абвясьціць, калі не былі пасланыя?" (Рым. 10:14-15).

Сьвятары і ёсьць тыя пасланыя Богам, каб несьці людзям адзіны сапраўдны Хлеб духоўны, прапаведуючы наша Божае ўсынаўленьне праз Госпада Нашага Ісуса Хрыста, даючы нам Яго ў Сьвятой Эўхарыстыі і прымiраючы нас з Тварцом у споведзі.

Беларускі сьвятар а. Язэп Гэрмановіч (1890-1978), вядомны як паэт Вінцук Адважны, у вершы "Прарок" так паэтычна апісвае пакліканьне:

Ах праняла усіх трывога –
Мы ўсе пачулі голас Бога:
"Каго пашлю на сьвет нікчэмны,
Хоць будуць там труды дарэмны?"
Прамовіў Бог – сьвяты навекі!
"Ня хочуць людзі зразумеці
Благія ўсе, хоць мае дзеці:
Хто пойдзе да таго народу,
Што ў грахох згубіў свабоду?"
Прамовіў Бог – сьвяты навекі.

Тут скалыхнулісь мае грудзі:
Благія, цёмны тыя людзі,
Але браты мае, аднак жа –
Там кроў мая жывая так жа.
І слухаў Бог – сьвяты навекі!
"Дык вось жа я, ах Божа мілы!
Слабы і цёмны, і пахілы:
Аднак запален і ачышчан,
Агнём нябесным я ахрышчан."
І слухаў Бог – сьвяты навекі.

Сярод беларусаў патрэба сваіх сьвятароў адчуваецца асабліва балюча. Будзем маліцца, каб добры Бог паклікаў беларускіх юнакоў і мужчынаў старэйшага веку да сваёй службы і каб яны шчыра адгукнуліся на Ягоны заклік.

Малітва за пакліканьні.

Госпадзе Ісусе Хрысьце, Пастыру душ, які зрабіў апосталаў Тваіх лаўцамі людзей, пакліч цяпер новых апосталаў у Тваёй Сьвятой Царкве. Запалі ў сэрцах іх руплівасьць аб душах людзкіх і гарачае жаданьне пашыраць Тваё валадарства на зямлі. Дай ім знайсьці радасьць у служэньні Табе і мужнасьць ісьці ўсьлед за Табою; бо Ты – Дарога, Праўда і Жыцьцё, і мы Табе славу аддаем, разам з адвечным Тваім Айцом і з усесьвятым, добрым і Жыцьцядайным Тваім Духам цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

Назначэньне а. Аляксандра Надсона.

17 студзеня г.г. Сьвяты Айцец назначыў а. Аляксандра Надсона, Апостальскага Візытатара для беларусаў, райцам (кансультарам) Кангрэгацыі для Ўсходніх Цэркваў.

Сьветлай Памяці Вінцэнт Жук-Грышкевіч

У аўторак 14 лютага ў Бэры (Канада), на 86-тым годзе жыцьця, памёр Др Вінцэнт Жук-Грышкевіч, пакінуўшы ў глыбокім суме ўдаву, Др. Раісу Жук-Грышкевіч, а таксама дачку Рагнеду і ўнукаў у Беларусі.

Нябожчык з маладых гадоў з усёй душой аддаўся беларускаму нацыянальнаму руху, які стаўся неадʼемнай часткай ягонага жыцьця. Як выкладчык гісторыі ў Беларускай Гімназіі ў Вільні ён узгадаваў цэлае пакаленьне беларусаў, сьведамае свайго слаўнага мінулага. Пасьля вайны, перажыўшы жудасьць савецкіх лагераў, Др Жук-Грышкевіч адразу ўзяўся за арганізацыю беларускага жыцьця на чужыне, перш у Англіі, а пасьля ў Канадзе. Ён быў таксама першым кіраўнікім беларускай сэкцыі радыя "Свабода", і праз шмат гадоў займаў адказнае становішча Старшыні Рады БНР.

Др. Жук-Грышкевіч быў чалавекам глыбокай веры, хоць і не любіў паказваць гэтага навонкі. Шчыры каталік, ён любіў і шанаваў братоў праваслаўных. Дык і ня дзіва, што на ягоных паховінах, побач з каталікамі, прысутнічалі і маліліся праваслаўныя беларусы.

Сьмяротныя астаткі Вінцэнта Жука-Грышкевіча чакаюць дня агульнага ўваскрасеньня на беларускіх могілках у Іст Бранcвік.

Apostolic Visitor for Byelorussians
Marian House,
Holden Avenue,
London N12 8HY, England